УДК 811.161.3’276.6.62

# Ваенная тэрміналогія ў аповесцях Васіля Быкава

Гаўрош Н.В., Савіцкая І.У.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

У мастацкім дыскурсе Васіля Быкава терміны становяцца элементамі рэалізацыі яго задумы. Ваенная тэрміналогія аповесцей адметная семанткай, структурай, паходжаннем, функцыянальным прызначэннем.

Паводле семантыкі акрэсліваюцца тэрміны, што абазначаюць:

- розныя віды ўзбраення і яго элементы: *танкі*: *«тыгры», «пантэры», «фердынанды», саракапятка, латунныя гільзы, снарад, перыскоп-разведчык, гарматка, казённік, станіна, мінамёт, буйнакаліберны кулямёт, аўтамат, транспарцёр, браневік, «скрыпуны», гусеніца/люк танка, біклага, патроны, «лапатнік» (самалёт), ПТА (проціганкавая абарона), ракета і інш.;*
- віды вайсковых збудаванняў: *акоп, акопны бруствер, снарадная ніша, траншэя, траншэі перадавой лініі, акоп-ровік, пехацінская траншэя, агнявя пляцоўка і інш.;*
- рангі воінскіх званняў, пасад: *наводчык, саракапятчыкі, «пушкары», старшы сяржант, «языкі», байцы, камандзір гарматы, начальнік артылерыі, камандзір батальёна, капітан, камбат, пехацінцы і інш.;*
- вайсковыя падраздзяленні: *полк, санбат, штаб, штрафная рота, батарэя, гарматны нумар, пяхота, артылерыя, шпіталь і інш;*
- загады: *«Стой! Назад!», «Агонь!»;*
- вайсковае абмундзіраванне: *гімнасцёрка, пілотка, генеральская папаха, пагоны, камбінезон;*
- знакі ўзнагарод: *ордэн Айчыннай вайны, медаль «За адвагу», гвардзейскі значок.*

Паводле структуры вылучаюцца тэрміны-словы: *салдаты, баец, пехацінец, артылерысты; танкі, гармата, кулямёт, мінамёт; пілотка, гімнасцёрка*; *казённік, прыцэл, разлік*; *бронетранспарцёр, камбат, санбат, кулямёт, самалёт, саракапятка, каробачкі-танкі БТР, ПТА і інш.*; і тэміны-словазлучэнні: *буйнакаліберны кулямёт, артылерыйскі разлік, акопны бруствер, шасціствольныя мінамёты, латунная гільза.* Асобна стаяць тэрміны, якія ўтварыліся ад агульных і ўласных назваў: нямецкія танкі: *«тыгры», «пантэры», «фердынанды».* Большасць тэрмінаў запазычаных: *артылерыя, батальён, батарэя, бруствер, плацдарм, траншэя, штаб, шпіталь, перыскоп і інш.* Асноўнай функцыяй ваенных тэрмінаў з’яўляецца паглыбленне чытача ў атмасферу апавядання. З дапамогай тэрміналагічнай лексікі Васіль Быкаў раскрывае атмасферу баявых дзеянняў, паказвае псіхалагічны стан чалавека-воіна ў экстрымальнай сітуацыі змагання за родную зямлю.